Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 ЛІСТАПАДА 2017 г. ЧАЦВЕР №212 (28576)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Заняткі для «маленькіх прынцаў»



Калі восень сапсавала настрой



Вёску на горад не прамяняем

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Генадзь БАЛБАТОЎСКІ, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва:**

*«У апошнія гады адзначаецца павелічэнне ахопу школьнікаў летнім аздараўленнем. У летнюю кампанію 2018 года гэты паказчык узрасце да 35% ад колькасці дзяцей школьнага ўзросту. Будучым летам, як і ў папярэднія гады, пуцёўкамі ў лагеры будуць забяспечаны ўсе ахвотныя і тыя юныя грамадзяне, якія маюць патрэбу ў аздараўленні. На летнюю аздараўленчую кампанію 2017 года было накіравана з рэспубліканскага бюджэту 39,4 млн. рублёў. На летніх канікулах 2017 года ў лагерах усіх тыпаў аздаравіліся 368 тысяч дзяцей».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9760 | ▲ |
| Еўра | 2,2988 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0735 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ДАЙ БОГ, І МЫ АХВЯРУЕМ СЭРЦЫ ДЛЯ РОДНАЙ ЗЯМЛІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзяды. Валожынскі раён.

■ Спадчына

## СВЯТЫНЯ НА СХІЛЕ

### Як ратуюць старажытную Каложу

**Новы этап работ вядзецца на драўлянай частцы, якая складае амаль палову царквы. Падчас рамонту зменяць абшыўку, устаноўяць новыя вокны і дзверы, узнімуць частку даху. Будоўля ідзе без прастояў, каб паспець да канца снежня асвоіць сродкі, якія выдзелены з Фонду Прэзідэнта сёлета ў ліпені.**

### Куды знікла сцяна

Знакаміты мураваны храм XII стагоддзя толькі часткова адпавядае часам пабудовы. А калі ўзірацца на яго, напрыклад, з набярэжнай Нёмана, ён бачыцца як звычайная драўляная царква. Такі выгляд Каложа набыла не так даўно — у канцы XIX стагоддзя. Драўляную сцяну вымушаны былі зрабіць замест мураванай, разбуранай паводкай. І цяпер ад крутога абрыву царкву аддзяляе ўсяго два метры. Блізкасць Нёмана — самая крытычная акалічнасць, якой на працягу некалькіх стагоддзяў стараюцца супрацьстаяць, каб выратаваць храм.

Згодна з архіўнымі дакументамі, у 1720 годзе размыты ракой схіл падышоў да самай царквы. Паўднёвая сцяна нахілілася. Каб спыніць апоўзень, было загадана пабудаваць каля падэшвы гары плот, высадзіць дрэвы. Аднак гэта мала дапамагло, і рака працягвала разбураць схіл. Спрыялі гэтаму плаціна і гавань на другім беразе, ад чаго рэчышча змянілася, і вада імкліва падступіла да Каложы. У 1845 годзе храм закрылі, бо на адной са сцен з'явілася пагрозлівая расколіна. Гэта частка разам з усёй паўднёвай сцяной у ноч з 1 на 2 красавіка 1853 года абрынулася ў Нёман...

СТАР. 13

■ Майстар-клас ад прадзедаў

## НАГАМ ЦЁПЛА — СЭРЦУ РАДАСНА!

**Зімою ў вёсачках Дрыбінскага раёна становіцца зразумела, якія ў мясцовых жыхароў самы распаўсюджаны промысел. Да надыходу маразоў мясцовы майстар апранае і абувае ўсю сям'ю — з цёплай авечай воўны выракляюць тут валёнкі, рукавіцы і шапкі-магеркі.**

СТАР. 4



Сучасныя валёнкі аздобленыя малюнкамі на любы густ.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!